ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дырэктар дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

_________ В. Л. Лакіза

«10» ____12____ 2024 года

# ВОДГУК

апаніруючай арганізацыі дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» на дысертацыю Сямашка Надзеі Канстанцінаўны «Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання

***Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны***

Дысертацыя Н. К. Сямашка «Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)» адпавядае спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання, галіне навукі – гістарычныя, галіне даследавання – гістарыяграфія ў адпаведнасці з пашпартам спецыяльнасці, зацверджаным ВАК Рэспублікі Беларусь (загад № 180 ад 01.06.2022).

***Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай праблемы з адзнакай яго значнасці***

Гістарычны вопыт ажыццяўлення навуковай дзейнасці па вырашэнні актуальных грамадскіх задач мае надзвычай важнае значэнне. На сучасным этапе адным з прыярытэтных кірункаў унутранай палітыкі Рэспублікі Беларусь выступае эканамічнае, сацыяльнае і культурнае развіццё беларускай вёскі. Вынікі вывучэння мінулага сельскагаспадарчай галіны, якая ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. складала аснову эканомікі, а зараз працягвае адыгрываць значную ролю ў народнай гаспадарцы нашай краіны, могуць дапамагчы ў распрацоўцы і паспяховай рэалізацыі мерапрыемстваў у агарарнай сферы. Акрамя таго, гістарыяграфічны ракурс даследавання актуалізуе праблемы функцыянавання навукі і ролі асобы вучонага, дае магчымасць выявіць значэнне інстытуалізацыі даследчыцкай дзейнасці ў якасці сродка павышэння яе сувязі з грамадскім жыццём, эфектыўнага выканання сацыяльных і культурных функцый. І сапраўды, з’яўленне ў Беларусі спецыяльных арганізацый па вывучэнні мінулага спрыяла паглыбленаму разгляду эвалюцыі аграрнага сектара

эканомікі. Н. К. Сямашка здолела паказаць уплыў змен дзяржаўнага ладу і сацыяльна-культурнага асяроддзя на метадалогію і змест навуковай прадукцыі, у тым ліку ў галіне гісторыі сельскай гаспадаркі. Актуальнасць яе дысертацыі абумоўлена яшчэ і тым, што пастаўленая праблема адносіцца да ліку не даследаваных належным чынам у айчыннай навуцы. Саіскальнік правяла паспяховае выяўленне і асэнсаванне гістарыяграфічнай спадчыны аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг., прасачыла агульны ход гістарычнай думкі па гэтым пытанні і прадставіла вынікі ў выглядзе самастойнай працы.

***Канкрэтныя навуковыя вынікі (з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата гістарычных навук***

Дысертацыя Н. К. Сямашка ўяўляе сабой першае ў айчыннай гістарыяграфіі комплекснае даследаванне пытанняў аграрнай гісторыі Беларусі перыяду распаду феадальных і зараджэння буржуазных адносін у праблемным полі расійскай і беларускай навукі другой паловы XIX – пачатку XX ст. з характарыстыкай адпаведных канцэптуальных падыходаў і метадаў, што складае навуковую навізну дадзенай працы.

У адпаведнасці з пп. 20–21 «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў» Надзея Канстанцінаўна Сямашка заслугоўвае прысуджэння ёй вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання за наступныя навуковыя вынікі:

- вызначэнне этапаў вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг.: 1) гістарыяграфія Расійскай імперыі (другая палова XIX ст. – 1917 г.); 2) гістарыяграфія савецкага перыяду (1917–1991 гг.); 3) гістарыяграфія ў Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі (1992 г. – пачатак XXI ст.); характарыстыку падыходаў, метадаў і форм прадстаўлення вынікаў даследавання, уласцівых для кожнага з гэтых этапаў;
- усебаковае раскрыццё праблемы крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы і пачатку фарміравання капіталістычнага ўкладу ў аграрным сектары эканомікі Беларусі праз прызму савецкай і сучаснай гістарыяграфіі; эвалюцыю поглядаў айчынных гісторыкаў па гэтым пытанні; высвятленне асноўных дыскусійных момантаў, адлюстраваных у асобных артыкулах, манаграфіях, абагульняючых калектыўных навуковых выданнях;
- выяўленне новых тэндэнцый у даследаваннях сельскай гаспадаркі дарэформеннага перыяду на этапе існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь; асэнсаванне ролі і месца прац сучасных айчынных гісторыкаў-аграрнікаў у раскрыцці розных аспектаў мінулага; абгрунтаванне перспектыўных напрамкаў вывучэння дадзенай праблематыкі ў наступны час.

***4. Заўвагі па дысертацыі***

Разам з тым, па дысертацыйным даследаванні можна выказаць некаторыя заўвагі і пажаданні.

Неабходна адзначыць некаторыя моманты і недахопы, якія паўплывалі на ацэнку працы ў цэлым. Так, аб'ект і прадмет даследавання фактычна дублююцца. У агульнай характарыстыцы работы на с. 6 храналагічныя рамкі ў прадмеце даследавання абазначаны адны (канец XVIII ст. – 1850-я гг.), а ў наступным радку – зусім іншыя (другая палова XIX – пачатак XXI ст.), геаграфічныя рамкі не акрэслены.

У спецыяльным раздзеле, прысвечаным метадалогіі даследавання, асновы арганізацыі працы дысертанта ў працэсе вывучэння абранай тэмы прадстаўлены невыразна. З тэксту на с. 36–37 цяжка зразумець, як суадносяцца паміж сабой прынцып сістэмнасці, комплексны, канцэптуальны і навуковы падыходы. Аўтар недакладна характарызуе агульналагічныя метады (індукцыя і дэдукцыя) і па невядомай прычыне ставіць пад сумненне абгрунтаванасць сваіх высноў: «*Метад індукцыі ўжываўся пры недастатковай колькасці інфармацыі ці яе супярэчлівасці. Таму нашы высновы носяць гіпатэтычны характар*» (с. 38).

Пэўныя выразы ў дысертацыі ўжываюцца без узгаднення з навуковай тэрміналогіяй, напрыклад, метадалагічная канцэпцыя (метадалогія і канцэпцыя – розныя паняцці), клерыкальная метадалогія (у чым яе сутнасць?), сталінскі вульгарызм (што гэта такое?), гендэрны і сацыяльны аспекты антрапалагічных пошукаў (антрапалогія – асобная навука са сваім прадметам і метадамі). Тэорыю мадэрнізацыі саіскальнік замест мадэрнізацыйнай памылкова называе мадэрнісцкай, выклікаючы ўстойлівыя асацыяцыі з адпаведнай мастацкай плынню мяжы XIX–XX ст.

У тэксце даволі дакладна разводзяцца паняцці «гістарычны факт» і «гістарыяграфічны факт», хаця спецыфіка даследавання патрабавала паглыбленага разгляду дадзеных катэгорый. Хаця тэрмін «гістарыяграфічная крыніца» выкарыстоўваецца саіскальнікам, можна меркаваць, што недастатковае раскрыццё яго сэнсу абумовіла такі істотны недахоп, як адсутнасць у дысертацыі раздзела з характарыстыкай крыніц. Не выклікае сумнення, што ад паўнаты, рэпрэзентатыўнасці, інфармацыйнай дакладнасці, аб'ектыўнасці, навуковай крытыкі і класіфікацыі крыніц шмат у чым залежыць якасць працы даследчыка. На сучасным этапе корпус гістарыяграфічных крыніц умоўна падзяляюць на дзве групы – асноўную (творы гісторыкаў) і дапаможную (справаводчыя дакументы, крыніцы асабістага паходжання – падрыхтоўчыя матэрыялы, чарнавікі, неапублікаваныя рукапісы, дзённікі, мемуары, аўтабіяграфіі, анкеты, лісты і інш.). І калі творы гісторыкаў выкарыстоўваліся (праўда, не заўсёды ў поўным аб'ёме), то другая група крыніц засталася па-за межамі пошукаў саіскальніка. На наш погляд, дысертацыя толькі выйграла б за кошт выкарыстання матэрыялаў асабістага фонда вядомага беларускага савецкага гісторыка В. У. Чапко ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь ці дакументаў Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі.

Размеркаванне матэрыялу па структурных частках дысертацыі, іх зместавае напаўненне не заўсёды ўяўляюцца аптымальнымі. У першай главе выклікае сумненне мэтазгоднасць разгляду перыядызацыі гісторыі, гістарыяграфіі гісторыі Беларусі ўвогуле, а не аграрнай гісторыі. Шмат увагі

надаецца працам, якія не маюць непасрэднага дачынення да заяўленага прадмета даследавання: адлюстроўваюць падзеі, што выходзяць за межы акрэсленага перыяду канца XVIII – першай паловы XIX ст. (с. 78, 95, 97 – 98, 100, 103), не ўпісваюцца тэматычна (с. 78, 104).

У той жа час недастаткова асвятляюцца пэўныя накірункі ў межах аграрнай праблематыкі, напрыклад, палітыка імперскіх уладаў у гэтай галіне. У дысертацыі не ўзгадваецца фундаментальная манаграфія Н. М. Дружыніна пра дзяржаўных сялян і рэформу П. Д. Кісялёва, якая стала буйной падзеяй у савецкай навуцы, а даследаванню В. Э. Загарульскай прысвечаны толькі адзін невялікі абзац на с. 82. Не разгледжана праца У. І. Пічэты «Обзор деятельности 1-го Западного комитета», дзе прыводзяцца звесткі пра дзейнасць гэтага органа па сялянскім пытанні, канфіскацыі маёнткаў удзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. Па-за межамі ўвагі саіскальніка засталася манаграфія па такой самай тэме сучаснай айчыннай даследчыцы А. В. Лепеш «Комитет западных губерний: организация и деятельность (1831–1848 гг.)». Не ўзгадваецца кандыдацкая дысертацыя В. С. Крапівіна, прысвечаная ўстановам дзяржаўных маёмасцей на тэрыторыі Беларусі ў 1839–1914 гг. Калі закранаецца пытанне сельскагаспадарчай адукацыі ў дарэвалюцыйнай і сучаснай гістарыяграфіі, то пажадана было б прааналізаваць найбольш змястоўную манаграфію пра Горыгорацкі земляробчы інстытут беларускага савецкага гісторыка С. Г. Цытовіча.

У главе 2 «Гістарыяграфія аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. перыяду Расійскай імперыі (сярэдзіна XIX – пачатак XX ст.)» утрымліваецца завостраная негатыўная ацэнка дарэвалюцыйных даследчыкаў за выкарыстанне імі апісальнага метада, высновы без апоры на крыніцы, наўмыснае змяншэнне ролі сацыяльна-эканамічнага фактару ў жыцці грамадства. Дадзеная характарыстыка можа быць пастаўлена пад сумненне. Напрыклад, сцвярджэнне пра тое, што В. В. Турчыновіч і А. Г. Кіркор характарызавалі Беларусь як самастойную дзяржаву (с. 46, 112) не адпавядае рэчаіснасці. Дысертант крытыкуе «метадалагічны падыход» Кіркора і спасылаецца на трэці том выдання «Живописная Россия», у прыватнасці на раздзел, прысвечаны сацыяльна-эканамічнаму развіццю Літвы і Беларусі, які быў напісаны асабіста рэдактарам гэтай кнігі славутым рускім навукоўцам П. П. Сямёнавым (с. 52). Палажэнні «метадалагічнай канцэпцыі» М. В. Каяловіча, рысы «клерыкальнага напрамку ў гістарыяграфіі», і, галоўнае, іх адбітак на змест даследаванняў па аграрнай гісторыі на с. 48–49 не тлумачацца. Не праводзіць саіскальнік і разбору твораў П. М. Жуковіча па вызначанай праблематыцы, абмяжоўваючыся выказваннямі, што «прафесар усхваляў палітыку самадзяржаўя ў Беларусі» і закранаў «пытанні становішча сялян без прычынна-выніковых сувязей» (с. 51). На с. 45 зроблена спроба аспрэчыць звесткі М. В. Без-Карніловіча пра становішча дзяржаўнай вёскі на падставе адсутнасці на беларускіх землях тэрытарыяльна-адміністрацыйнай адзінкі «округ» аж да 1924 г. У Расійскай імперыі існавалі ведамасныя акругі (навучальныя, ваенныя, шляхоў зносін і інш.), і ў тэксце дарэвалюцыйнага аўтара размова ішла пра мясцовыя органы кіравання

дзяржаўнымі маёмасцямі – палаты і падпарадкаваныя ім акругі. На с. 44 напісана пра ўвядзенне М. В. Без-Карніловічам новага паняцця ў дачыненні да сістэмы землекарыстання – «общественная запашка», хаця, зразумела, гэты тэрмін з'явіўся не ў працы згаданага аўтара, а ў імперскім заканадаўстве.

У дысертацыі не аналізуюцца даследаванні этнографаў (П. М. Шпілеўскага, Ю. Ф. Крачкоўскага і інш.), якія ўтрымлівалі звесткі пра развіццё сельскай гаспадаркі і жыхароў беларускай вёскі. Падаецца, тут назіраецца некрытычнае ўспрыняцце характэрнага для савецкай гістарыяграфіі меркавання пра празмерную ўвагу, якую дарэвалюцыйныя аўтары надавалі аналізу сялянскага саслоўя з бытавога, этнакультурнага, рэлігійнага пунктаў гледжання. У апошнія дзесяцігоддзі гэтыя каштоўныя назіранні выклікаюць вялікую цікавасць з боку сучасных гісторыкаў-аграрнікаў.

Нельга пагадзіцца са сцвярджэннем дысертанта пра тое, што ўпершыню з шэрагу аграрных праблем гістарычнай навукі паняцце «сялянскае пытанне» было вылучана У. М. Ігнатоўскім (с. 96). Нашмат раней за беларускага гісторыка яго актыўна выкарыстоўвалі такія вядомыя дарэвалюцыйныя даследчыкі, як В. І. Сямеўскі, К. Д. Кавелін, В. В. Ключэўскі і інш.

У главе 4, дзе прадугледжваецца аналіз гістарыяграфіі Расійскай Федэрацыі, разгляд пытанняў дзяржаўнага кіравання і кадравай палітыкі (с. 87–88), на наш погляд, не патрабуецца. А вось агульная характарыстыка стану даследаванняў аграрнай гісторыі з вылучэннем галоўных тэндэнцый і імёнаў найбольш выбітных спецыялістаў неабходна. Сярод іх можна вылучыць А. Н. Далгіх, аўтара манаграфіі «Крестьянский вопрос во внутренней политике российского самодержавия в конце XVIII – первой четверти XIX вв.» (у ёй маюцца асобныя прыклады па заходніх губернях Расійскай імперыі). Саіскальнік справядліва адзначыла, што ў канцы XX – пачатку XXI ст. у айчыннай гістарыяграфіі наглядаўся працэс пераасэнсавання праблем крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы і генезісу капіталізму ў Беларусі, зыходзячы з новых метадалагічных падыходаў. Аднак у тэксце нават у агульных рысах не раскрыты асноўныя палажэнні тэорыі мадэрнізацыі і не паказана яе ўвасабленне ў канкрэтных працах расійскіх і беларускіх гісторыкаў па аграрнай праблематыцы. У дысертацыі не ўзгадваюцца вынікі даследаванняў вядомага расійскага спецыяліста ў галіне сацыяльнай гісторыі Б. М. Міронава, які на падставе выкарыстання антрапаметрычных даных зрабіў выснову пра паступовае павышэнне дабрабыту сялян на працягу дарэформеннага перыяду і паставіў пад сумненне тэзіс аб эканамічным заняпадзе гаспадаркі, заснаванай на прыгонным праве.

Звяртае на сябе ўвагу вялікая колькасць арфаграфічных памылак, лагічных паўтораў і стылістычных недахопаў у тэксце дысертацыі і аўтарэферата. Сустракаецца шэраг няўдалых выразаў: крынічная база, аргументаванні гісторыкаў, храналагічная перыядызацыя, юрыдычная гісторыя. Падобнае ўражанне застаецца і ад цэлых сказаў: «*Асноўнай павіннасцю заставалася паншчына, якая ў 50-я гг. XIX ст. склала 97 % усіх прыватнаўласніцкіх сялян Беларусі*» (с. 89); «*Толькі ў канцы 20-х – першай палове 30-х гг. XX ст. савецкія гісторыкі засвоілі тэарэтычныя асновы марксізму, у тым ліку і ў даследаванні*

*пытанняў аграрнай гісторыі, пазнаёміліся з працамі У. І. Леніна адносна гэтага пытання»* (с. 59). Здаецца, раней пра марксізм і ленінскія творы яны не ведалі. Прывядзем яшчэ адзін прыклад са с. 79: «*Такім чынам, можна заўважыць працэс уніфікавання канцэпцыя гісторыі БССР характэрнай для сярэдзіны 1950-х – сярэдзіны 1980-х гг. і прадстаўленай ў гісторыі БССР, наратывы якой былі выдадзены ў 1948 г., 1954 г. і 1972 г.*» (арфаграфія і пунктуацыя аўтара захоўваюцца). Даволі нечакана выглядае заключны сказ дысертацыі: «*Аграрная гісторыя, якая сфарміравалася ў якасці асобнага кірунка ў гістарыяграфіі на пачатку XX ст., павінна стаць самастойным прадметам даследавання*». У такім кантэксце ўзнікае пытанне пра мэты і змест дадзенай дысертацыі.

Разам з тым выказаныя заўвагі не зніжаюць навуковай вартасці дысертацыі і не ўплываюць на яе палажэнні і вынікі.

***Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую яна прэтэндуе***

Праведзеная праца па самастойным зборы эмпірычнага матэрыялу, разглядзе беларускай і расійскай гістарыяграфіі, падрыхтоўцы тэкста дысертацыі, высноў дазваляе сцвярджаць, што навуковая кваліфікацыя саіскальніка адпавядае вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.

***Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў***

Вынікі дысертацыйнага даследавання, яго палажэнні, высновы і фактычны матэрыял могуць выкарыстоўвацца падчас стварэння новых выданняў па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі, гістарыяграфіі айчыннай гісторыі. Атрыманыя саіскальнікам звесткі маюць патэнцыял практычнага прымянення ў вучэбным працэсе пры распрацоўцы зместу курсаў гістарыяграфіі ў вышэйшых навучальных установах.

***Заключэнне***

У адпаведнасці з загадам дырэктара дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (№86а ад 22 лістапада 2024 г.) водгук падрыхтаваны экспертам – загадчыкам аддзела гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX стагодзяў, кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам Новік Наталляй Яўгенаўнай і абмеркаваны на пасяджэнні навуковага семінара дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (пратакол № 1 ад 10 снежня 2024 г.).

Саіскальнік Н. К. Сямашка выступіла з дакладам па дысертацыі, прыняла ўдзел у навуковай дыскусіі.

На пасяджэнні навуковага семінара дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» прысутнічалі 6 чалавек, з іх кандыдатаў гістарычных навук – 6. Па профілю дысертацыі (07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання) і блізкіх спецыяльнасцей на пасяджэнні навуковага семінара прысутнічала 6 спецыялістаў. Вынікі адкрытага галасавання членаў навуковага семінара па дысертацыі Н. К. Сямашка: «за» – 5, «супраць» – 1, «устрымаліся» – 0.

**ПАСТАНАВІЛІ:** Зацвердзіць афіцыйны водгук на дысертацыю Сямашка Надзеі Канстанцінаўны «Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі

Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)», прадстаўленую на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

Старшыня навуковага семінара
кандыдат гістарычных навук — П. А. Трубчык

Эксперт
кандыдат гістарычных навук — Н. Я. Новік

Сакратар
кандыдат гістарычных навук — А. Э. Сакольчык

Трубчык П.А., Новік Н.Я.,
Подпісы Сакольчык А.Э. сведчу
Вяд. спецыяліст па кадрах
"10" 12 2024 г.